Аляксей Мікалаевіч Кулакоўскі нарадзіўся 24.12.1913г. у вёсцы Кулакі Старобінскага (цяпер Салігорскага) раёна Мінскай вобласці ў сялянскай сям'і. Скончыўшы пачатковую школу, некаторы час памагаў бацькам па гаспадарцы. У 1929-1930гг. займаўся ў рагачоўскай прафтэхшколе, пасля заканчэння якой некалькі месяцаў узначальваў арцель бондараў у Касцюковіцкім раёне. Потым супрацоўнічаў у клімавіцкай раённай газеце «Камуна» (1931-1934), быў адказным сакратаром жлобінскай газеты «Шлях сацыялізма» (1934), намеснікам загадчыка аддзела сельскай моладзі ў рэдакцыі «Чырвоная змена».

У 1936-1939 гг. вучыўся ў Мінскім настаўніцкім інстытуце, пасля заканчэння быў выкладчыкам мовы і літаратуры ў Цяцерынскай сярэдняй школе Круглянскага раёна Магілёўскай вобласці. Увосень таго ж года яго прызвалі на службу ў Савецкую Армію. У час Вялікай Айчыннай вайны знаходзіўся на фронце, камандаваў спачатку ўзводам, потым – ротай. Быў тройчы паранены.

Пасля дэмабілізацыі (1945г.) працаваў загадчыкам аддзела ў газеце «Сталинская молодежь», у часопісе «Беларусь», адказным сакратаром газеты «Літаратура і мастацтва». У 1953–1958 гг. – галоўны рэдактар часопіса «Маладосць». Быў адказным сакратаром праўлення СП БССР (1965-1976). У 1977-1986 гг. – дырэктар Літаратурнага музея Янкі Купалы. У 1972г. у складзе дэлегацыі БССР прымаў удзел у рабоце XXVII сесіі Генеральнай Асамблеі ААН.

Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, двума ордэнамі «Знак Пашаны» і медалямі. Член КПСС.

Пісаць пачаў яшчэ да вайны., друкаваў у газетах нарысы, замалёўкі. Але сталай літаратурнай працай заняўся пасля дэмабілізацыі. У 1945г. у 9-м нумары часопіса «Беларусь» было надрукавана першае апавяданне А.Кулакоўскага «Мой сын», а ў 1947г. першы зборнік апавяданняў «Сад». Малады пісьменнік літаральна з першых твораў напаткаў свайго героя…Гэтага героя пісьменніку не трэба было шукаць дзесці на старане – варта было прыглядзецца да сваіх землякоў-старобінцаў. Іх аўтар ведаў з дзяцінства, але па-сапраўднаму спазнаў, зразумеў, ацаніў пасля вайны.

Цэнтральным героем твораў А.Кулакоўскага з'яўляецца чалавек працы, просты і вялікі аднachасова. Ён просты, але не просценькі, не шэры.

Вось Павел Капула – герой апавядання «Нямко». Былы парабак, бабыль, якога ў вёсцы крыху чужаліся і пабойваліся за звычайную для яго замкненасць і суровасць.

Вызначаўся ён працавітасцю, умельствам рабіць розныя рэчы і яшчэ – сілай. Нехта быццам бачыў, як Нямко, так звычайна звалі Паўла аднавяскоўцы – у гневе зваліў з ног жарабка, але мала хто ведаў, як па-свойму тонка адчувае ён прыроду, якое спагадлівае ў яго сэрца, якая шчырая любоў у яго да ўсяго жывога…

У кнізе Гардзіцкага «Дыялогі» у інтэрв'ю пісьменніку А.Кулакоўскі раскрывае гісторыю напісання «Нямко»:

«Мне ўспомніўся аднакашнік – нямы хлопец, якога ўсе баяліся. Пабайваўся яго і я: здавалася, што ён і ўдарыць чалавека можа. І вось аднойчы гэты хлопец знайшоў птушанятка, што вывалілася з гняздзечка. Я бачыў, як ён любоўна ўзяў гэтае птушанятка ў рукі. З гэтай дэталі і вырас пасля сюжэт апавяднння «Нямко». Потым пры далейшым роздуме, паявіўся сацыяльны матыў, звязаны з вайной, – гэта я ўжо дамысліў; паступова з'яўляліся і дабаўляліся іншыя дэталі, і нарэшце апавяданне стала такім, якім яго можна пачытаць у першым зборніку «Сад» і ў кнізе «Хораша ўзыходзіць сонца».

А.Кулакоўскі прыйшоў у літаратуру як летапісец сучаснасці. Большасць яго твораў пра тое, што адбываецца на нашых вачах, аб фарміраванні чалавека новага светапогляду, аб зменах у жыцці і псіхалогіі.

Вось аповесць «Нявестка» (1955г.), якая карыстаецца заслужаным поспехам у чытача. Гэта твор, у якім Кулакоўскі адным з першых пасля ХХ з'езда партыі зірнуў на жыццё вёскі больш рэалістычна, паказаў тое добрае, што прыйшло ў вёску дзякуючы прынятым партыяй мерам, накіраваным на пераадоленне адставання сельскай гаспадаркі, павагай да патрэб працоўнага чалавека.

Як пісаў сам аўтар, штуршком для стварэння апавядання «Нявестка» паслужыла невялікая жыццёвая драбніца:

«Мне часта даводзілася бываць у той вёсцы, дзе нарадзіўся. Там жыве ў мяне маці, брат. І вось аднаго разу мая маці кажа: - Міканор учора хваліўся, маладая нявестка вады яму нагрэла, сказала: «Папар, тата ногі, кашляць не будзеш».

…Мне пачаў уяўляцца лёс старога чалавека, які рана аўдавеў і многа год пражыў у адзіноце. Не бачыў гэты чалавек сапраўднага шчасця, не адчуваў цёплай жаночай спагады…У яго душа забалела па цёпламу, сардэчнаму слову сына, па цёплых вачах дачкі.

Распалася малая сям’я Віктара Бірука. Якая гэтаму прычына? Можа гэта здарылася таму, што Віктар пачаў выпіваць? Так, і ў гэтым прычына, але больш у тым, што жонка адчула мужаву абыякавасць, нежаданне дзяліцца з блізкімі яму людзьмі малымі і вялікімі клопатамі. Але ў складанай сітуацыі выяўляецца высакароддзе маладой жанчыны: пакінуўшы Віктара, яна шчыра клапоціцца пра яго бацьку. А калі той сыходзіць з дому і аказваецца ў бальніцы, знаходзіць яго і дапамагае ў самую цяжкую хвіліну.

Аповесць сцвярджае высокі гуманізм чалавечых учынкаў і адвяргае жорсткасць у людскіх узаемаадносінах. Чытаючы твор, мы даведваемся, як нялёгка было людзям пераадолець пасляваенныя цяжкасці.

Твор і сёння хвалюе чытача, бо у ім намаляваны праблемы, далёка не часовага характару. І яшчэ. Аповесць пабудавана на быце. На бытавым матэрыяле, яркім, характэрным, праз жывыя мастацкія вобразы А.Кулакоўскі гаворыць аб важным, што схавана глыбей у жыцці, у чалавеку. Па гэтай аповесці на студыі «Беларусьфільм» была пастаўлена кінакарціна «Шчасце трэба берагчы» па сцэнарыю Андрэя Макаенка.

Чалавек нараджаецца для шчасця. Верыла ў сваё шчасце і гераіня Зіна з апавядання «Дванаццаты жорсткі». Кулакоўскі расказвае аб жыццёвай драме, прыгожай, душэўна багатай жанчыне, быўшай салістке хору Штовіча, якая звязала свой лёс з чалавекам нязлым, кампанейскім, але на дзіва пустым, самаўпэўненым лейтэнантам. Ён бесклапотны, заняты толькі сабой і сваімі ўцехамі: гульнёй у карты, любіць выпіць. Жанчына сама сабе баіцца прызнацца ў сваёй памылцы, а яшчэ больш баіцца таго, каб аб нечым здагадаўся пасажыр, што едзе з імі ў адным купэ. Ёй так хочацца адчуваць сябе шчаслівай жонкай і маці. «Хоць перад чужым будзь чалавекам!» – просіць яе нясмелы погляд, але яе Валодзя не можа не быць самім сабой, страшэнна пустым і самаўпэўненым хамам, са сваім бесклапотным і нахабным свістам у вагоне, перад чужымі людзьмі.

Праз дэталі раскрывае мастак драму жанчыны. Яна бачыць «жорсткую», бязлітасную праўду, але ўсё яшчэ баіцца яе, вельмі не хоча адчуваць сябе няшчаснай.

У аповесці «Дабрасельцы» А.Кулакоўскі выкрыў дэмагогаў і кар'ерыстаў, за што паплаціўся пасадай галоўнага рэдактара часопіса «Маладосць».

Да праблемы суадносін урбанізацыі і традыцыйных маральных устояў пісьменнік звярнуўся ў цыкле апавяданняў «Салігорскія эцюды».

Сваю кнігу «Родныя шыроты» – дакументальную аповесць з аднайменнай назвай празаік прысвяціў салігорцам, будаўнікам, шахцёрам, учарашнім калгаснікам.

Былі выдадзены кнігі: аповесць «Гартаванне» (1949), зборнік апавяданняў «Новыя сустрэчы» і кніжка апавяданняў для дзяцей «На возеры» (1950), зборнік апавяданняў і аповесцей «Хораша ўзыходзіць сонца» (1952), раман «Расстаемся ненадоўга» (1955), «Незабыўнае рэха» (1956), аповесці «Да ўсходу сонца» (1957) і «Тут я жыву» (1960), раман «Сустрэчы на ростанях» (1962), зборнік апавяданняў і аповесцей «Першае каханне» (1965), аповесць «Расце мята пад акном» (1966), зборнікі прозы «Чыстая мураўка» і «Твой шлях перад табою» (1968).

Аляксей Кулакоўскі зрабіў літаратурны запіс кнігі В.Казлова «Людзі асобага складу» (1952). Пераклаў раманы Ш.Рашыдава «Мацней за буру» (з П.Кавалёвым, 1963) і Р.Файзі «Яго вялікасць Чалавек» (1978).

Памёр Аляксей Мікалаевіч Кулакоўскі 9 красавіка 1986 года.

### *Іван Шамякін аб творчасці Аляксея Кулакоўскага*

«Аляксей Кулакоўскі – бытапісец. У творчасці ён надзвычай моцна прывязаны да канкрэтных, часцей за ўсё ўласна ім самім перажытых жыццёвых фактаў. Факт для яго – першааснова твора. Прызма творчай фантазіі пісьменніка не надта адмыслова шматгранная, святло фактаў пераламляецца ў ёй не заўсёды так, каб адбіцца спектрам вясёлкі і ў сюжэце, і ў характарах, і ў дэталях, каб драматызавацца, і асобныя факты, прапушчаныя цераз гэтую прызму, у творы захоўваюць тыя ж адцэнні, што і ў жыцці. Пісьменнік як бы спадзяецца, што само жыццё зрабіла работу па адборы і тыпізацыі з’яў і характараў. Такая асаблівасць таленту Кулакоўскага дае яму пэўную перавагу перад іншым падыходам да асваення жыццёвага матэрыялу, мае свае станоўчыя якасці, але абумоўлівае пэўныя едахопы…»

**Лепшыя кнігі**

**Аляксея Мікалаевіча Кулакоўскага**




... Яны былі яшчэ зусім маладыя і толькі пачыналі жыццё. Горача пакахалі адзін аднаго, марылі разам жыць і працаваць. Але пачалася вайна, усё змянілася. Андрэй узяў у рукі зброю, а Вера эвакуіравалася ў глыбокі тыл. Пра тое, як склаўся лёс гэтых людзей у гады вайны, якія цяжкасці ім прыйшлося пераадолець, аўтар і распавядае на старонках другой кнігі дылогіі. Першая – раман «Расстаемся ненадоўга».




«Белы Сокал» - пасмяротная кніга аднаго з вядучых беларускіх празаікаў Аляксея Кулакоўскага, у якую ўвайшлі аповесці, апавяданні і лірыка-філасофскія мініяцюры. Усе аповесці пісьменніка прысвечаны тэме Вялікай Айчыннай вайны і аб'яднаны адзіным унутраным сюжэтам: лёс звычайнага, радавога салдата на вайне. Праблеме аховы прыроды, беражлівага, разумнага выкарыстання яе нетраў прысвечана большасць лірычных мініяцюр.




Кніга прысвечана падзеям Вялікай Айчыннай вайны. Аўтар пераканаўча паказвае гераізм і непераможную сілу савецкага народа на фронце, у тыле і на акупіраванай нямецка-фашысцкімі захопнікамі тэрыторыі.

Раман пісьменніка «Тропы хоженые и нехоженые» - шматпланавы твор, у якім адлюстравана жыццё беларускай палескай вёскі з першых дзён усталявання савецкай улады да пачатку разгортвання масавага партызанскага руху ў гады Вялікай Айчыннай вайны.







Кнігу склалі яго лепшыя творы, прысвечаныя гераічнай і трагічнай сутнасці вайны (аповесці «К восходу солнца», «Белый Сокол», «Хлеборез»), цяжкаму жыццю пасляваеннай вёскі (аповесці «Невестка», «Добросельцы») і сённяшняму дню.

Аляксей Мікалаевіч Кулакоўскі належыць да старэйшага пакалення сучасных беларускіх пісьменнікаў. Яго творы, якія склалі гэтую кнігу, распавядаюць аб розным. Ад часу калектывізацыі да пярэдадня масавага партызанскага руху ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Гісторыя кахання, перыпетыі якой звязаны з цяжкім працэсам росту грамадскай самасвядомасці ў калектыве людзей, якія будуюць мірнае жыццё ў новым горадзе – цэнтры здабычы калійных соляў, – пра гэта аповесць «Растет мята под окном».






Творчасць А.Кулакоўскага жанрава і тэматычна багатая і разнастайная. У многіх творах багатая аўтабіяграфічная аснова. Аднатомнік склалі раман «Сцежкі зведаныя і нязведаныя», лепшыя аповесці, апавяданні і крытычныя артыкулы.

## Конкурс знатакоў беларускай мовы

Калі чытаеш творы А.Кулакоўскага, нельга не адзначыць прыгажосць аўтарскай мовы. Пісьменнік упрыгожвае сваю прозу сакавітымі, самабытнымі словамі. Прапануем правесці конкурс знатакоў беларускай мовы па творах пісьменніка. Уявіце сябе літаратурнымі перакладчыкамі.

### Аповесць «Тры зоркі»

1. Міканор **клыпаў ціхам** па вуліцы.
   (Миконор **потихоньку ковылял** по улице)
2. Хлапчук з зарослай патыліцай **порстка** круціў педалі.
   (Мальчик с заросшим затылком **резво** крутил педали)
3. Жанчына стала **пыніцца** ў хаце, рабіла ўсё ціха, хадзіла **на кіпеньках**.
   (Женщина стала **прибираться** в доме, делала всё тихо, ходила **на цыпочках**)
4. Мне ўсё роўна, дзе ісці, **ступак** у мяне нічога не разбірае.
   (Мне всё равно, где идти, у меня **ступня** ничего не чувствует)

### Аповесць «Нявестка»

5. Гэта Даніла прынёс **пад крысам** з калгаснай **адрыны**.
   (Это Данила принёс **под полой** с колхозного **сеновала**)
6. Назапускаў дзяўчынцы ў валасы гэты кепскі хлапчук калючага **дзядоўніку**.
   (Этот скверный мальчишка набросал девочке в волосы колючего **репейника**)

7. На вуліцы **падшэрхла** нанач, і калі хто ішоў, то боты месцамі грукалі па голай зямлі.

   (К ночи на улице подсохло, и когда кто-нибудь шёл, то местами сапоги стучали по голой земле)

8. Ён нахіліўся **над парэнчамі**, спрабуючы дастаць рукою ваду.

   (Он склонился **над поручнями** (перилами), стараясь рукой достать до воды)

9. Праз якія **гоні** ці двое ў Данілы пачала з'яўляцца неадчэпная думка, што да Крушнікаў яму не дацягнуць.

   (Пройдя одну-другую **пахоту**, у Данилы стала появляться неотступная мысль, что до Крушников ему не дотянуть)

10. Жарылі пад барабан так, што аж **пыл курэў з-пад ног**.

    (Шпарили под барабан так, что **под ногами стояла пыль столбом**)

**Аповесць «Расце мята пад акном»**

11. Сяк-так абмінаючы выбоіны і **тванныя мясціны**, ён паволі набліжаўся да барака.

    (Кое-как минуя ухабы и **топкие места**, он неторопливо приближался к берегу)

12. А цяпер вам у канец і там **напрасткі поплавам**.

    (А теперь вам до конца и там **напрямик лугом**)

13. Тут усяго дзве **суцэльныя маснічыны**, але ў мяне вопыт, кожны дзень хаджу.

    (Тут всего две **цельные кладки**, но у меня опыт, каждый день хожу)

14. **Горнасць адольвала**, мабыць, ад дзвюх прычын: невядома, дзе цяпер бібліятэка і ці ёсць яна наогул.

    (**Горечь одолевала**, наверное, по двум причинам: неизвестно, где теперь библиотека и есть ли она вообще)

15. Леанід ведаў, што на талерцы павінна быць сала, парэзанае **на скрыгалікі**.

    (Леонид знал, что на тарелке должно быть сало, порезанное **ломтиками**)

**Літаратуратурная віктарына аб жыцці**

**і творчасці А. Кулакоўскага**

**Мэта віктарыны –** зацікавіць тых, хто ўпершыню пачуў прозвішча аўтара, заахвоціць іх прачытаць апавяданні, аповесці і раманы пісьменніка, якія не толькі цікавыя сваім сюжэтам, але і вельмі пазнавальныя, а для тых, хто чытаў яго творы паглыбіць свае веды.

1) *Дзе і калі нарадзіўся Аляксей Кулакоўскі?* (**у вёсцы Кулакі Старобінскага раёна 24 снежня 1913г.**);
2) *Галоўным рэдактарам якога часопіса быў з 1953г. па 1958г.?* (**«Маладосць»**);
3) *Якую навучальную ўстанову скончыў пісьменнік у 1931г.*? (**Рагачоўскую прафтэхшколу**);
4) *У якім годзе выйшла першае апавяданне і як яно называецца?* (**«Мой сын» у 1945г.**);
5) *Аляксей Кулакоўскі аўтар раманаў…*? (**«Расстаемся ненадоўга» (1955г.), «Незабыўнае рэха» (1956г.**);
6) *У якім годзе выйшаў зборнік апавяданняў і аповесцей «Хораша ўзыходзіць сонца»*? (**1952г**.);
7) *Якія раманы пераклаў пісьменнік*? (**Ш.Рашыдава «Мацней за буру» (1963) і Р.Файзі «Яго вялікасць Чалавек» (1978г.);**
8) *Дырэктарам якого музея быў з 1977г. па 1986г.?* (**Літаратурны музей Янкі Купалы**);
9) *Памёр А.Кулакоўскі …?* (**9 красавіка 1986г**.).

**Рэкамендуем правесці мерапрыемствы,**

**прысвечаныя 110-годдзю з дня нараджэння А.М. Кулакоўскага:**

- «Жыццё пісьменніка – жыццё беларускага народа»: гутарка-знаёмства;
- «Чалавек, пісьменнік, грамадзянін»: вечар-рэквіем;
- «Выдатны беларускі пісьменнік, перакладчык»: вечар-партрэт;
- «Чытаем разам творы А.М.Кулакоўскага»: акцыя;
- «Жыццёвы і творчы шлях»: літаратурная гадзіна;
- «І жыве твой радок, і жыве тваё слова»: літаратурны вечар;
- «Талент неспакойны, чулы»: творчы партрэт.

**Успаміны пра А. Кулакоўскага:**


1. Кулакоўскі, М. Слова пра брата / Міхась Кулакоўскі // Маладосць. – 1995. – №3. – с. 230 – 244.
2. Василевич, А. Королищевичи, Королищевичи..: нехрестоматийные страницы / Алена Василевич; Пер. с бел. В. Машкова // Неман. – 1997. – №4. – С. 179 – 193.
3. Городицкий, А. Встречи / Алексей Городицкий; Пер. с бел. Н. Денисовой // Неман. – 1998. – №9. – С. 43 – 150.


**Творы Аляксея Кулакоўскага:**


1. Кулакоўскі, А. Збор твораў у 4-х т. Т. 1. Апавяданні. – Мінск: Беларусь, 1970. – 400 с.
2. Кулакоўскі, А. Збор твораў у 4-х т. Т. 2. Аповесці. – Мінск: Беларусь, 1970. – 390 с.
3. Кулакоўскі, А. Збор твораў у 4-х т. Т. 3. Растаемся ненадоўга: раман. – Мінск: Беларусь, 1971. – 384 с.
4. Кулакоўскі, А. Збор твораў у 4-х т. Т. 4. Сустрэчы на ростанях: раман. – Мінск: Беларусь, 1971. – 352 с.
5. Кулакоўскі, А.М. Выбраныя творы. У 2-х т. – Мінск: Маст. літ., 1984.
6. Кулакоўскі, А. Аповесці і апавяданні. - Мінск: Маст. літ., 1979. - 496 с.
7. Кулакоўскі, А. Белы сокал: аповесць для ст. шк. узросту. – Мінск: Юнацтва, 1985. – 303 с.
8. Кулакоўскі, А.М. Васількі: раман. – Мінск: Маст. літ., 1981. – 240 с.
9. Кулаковский, А.Н. Встречи на росстанях: роман / Алексей Кулаковский; пер. с белорусского Е. Мозолькова. – Минск: Маст. літ., 1982. – 352 с.
10. Кулакоўскі, А. Высоцкі // Беларусь. – 1965. – №9. – С. 6 – 9.
11. Кулаковский, А. Здесь я живу. Растет мята под окном. – Мінск: Маст літ., 1973. – 269 с.
12. Кулакоўскі, А. Зоркі салігорскія: нарыс: аб будаўніках Салігорскага калійнага камбіната. – Мінск: Дзярж. выд. БССР, 1960. – 22 с.
13. Кулакоўскі, А. На Случчыне гараць капры: нарыс аб Салігорску і яго людзях /А. Кулакоўскі // Полымя. – 1960. – №10. – С. 108 – 115.
14. Кулакоўскі, А.М. Незабыўнае рэха. – Мінск: Дзярж. выд. БССР, 1956. – 204 с.

15. Кулакоўскі, А. Некалькі разваг і меркаванняў / А.Кулакоўскі // ЛіМ. – 1971. – 10 снежня.
16. Кулакоўскі, А. Першае чаканне. Салігорскія эцюды: аповесці. – Мінск: Беларусь, 1965. – 238 с.
17. Кулакоўскі, А. Першы нумар / А. Кулакоўскі // Маладосць. – 1988. – №2.
18. Кулаковский, А.М. Повести и рассказы: пер с белорусского / Вступ. сл. С. Андреюка. – Мінск: Маст. літ., 1991. – 447 с.
19. Кулаковский, А. Расстаемся ненадолго: роман. – Мінск: Маст. літ., 1977. – 352 с.
20. Кулакоўскі, А.М. Родныя шыроты: аповесці і апавяданні. – Мінск: Маст. літ., 1978. – 224 с.
21. Кулакоўскі, А. Салігорскія навіны / А. Кулакоўскі // Работніца і сялянка. – 1964. – №1. – С. 4 – 5.
22. Кулаковский, А.Н. Солигорцы // Звезда. – 1964. – №7. – С. 158 – 169.
23. Кулаковский, А. Солигорские встречи: очерк/ А. Кулаковский // Агитатор. – 1964. – №13. – С. 56 – 58.
24. Кулакоўскі, А. Сцежкі зведаныя і нязведаныя: раман. – Мінск: Маст. літ., 1974. – 304 с.
25. Кулакоўскі, А.М. Сэрцы палымяныя...: На будаўніцтве Салігорскага калійнага камбіната: з запісной кніжкі пісьменніка / А.М. Кулакоўскі // Мінская праўда. – 1959. – 26 снежня.
26. Кулакоўскі, А.М. Твой шлях перад табою / прадм. С.А. Гусака. – Мінск: Нар. асвета, 1968. – 188 с.
27. Кулаковский, А.М. Тропы хоженые и нехоженые: роман / А.Н. Кулаковский. – Мінск: Худож. лит., 1978. – 422 с.
28. Кулакоўскі, А. Тры зоркі: аповесці: для сярэд. і ст. шк. узросту. – Мінск: Юнацтва, 1988. – 206 с.
29. Кулакоўскі, А. Тут я жыву..: Аповесць. – Мінск: Дзярж. выд. БССР, 1960. – 173 с.
Кулакоўскі, А.М. Чыстая мураўка // ЛіМ. – 1963. – 29 лістапада.

**Аб жыцці і творчасці Аляксея Кулакоўскага:**


1. Аляксей Кулакоўскі // Беларускія пісьменнікі (1917–1990): даведнік / склад. А.К. Гардзіцкі. – Мінск: Маст. літ., 1994. – С. 310 – 311.
2. Аляксей Кулакоўскі // Пісьменнікі Савецкай Беларусі. Кароткі біябібліяграфічны даведнік. – Мінск, 1970. – С. 206 – 207.
3. Аляксей Кулакоўскі: Літаратурныя мясціны. Салігорскі раён // Маладосць. – №3. – С. 122 – 124.
4. Аляксей Кулакоўскі: таленты Салігоршчыны // Салігорскі веснік. – 1993. – 1 снеж.
5. Андраюк, С. Вывяраючы жыццём. Крытычныя артыкулы. – Мінск: Маст. літ., 1976. – С. 196.
6. Андраюк, С. Жыццё. Літаратура. Героі. – Мінск: Навука і тэхніка, 1973. – С. 12 – 19.
7. Андраюк, С. Талент неспакойны, чулы: Літаратурны партрэт А. Кулакоўскага / С. Андраюк // Роднае слова. – 1993. – №12. – С. 5 – 11.
8. Беларуская савецкая проза. Апавяданне і нарыс. – Мінск: Навука і тэхніка, 1971. – С. 106 – 108; 114 – 116; 119 – 121; 132 – 135; 207; 246.
9. Беларуская савецкая проза. Раман і аповесць. – Мінск: Навука і тэхніка, 1971. – С. 228 – 229; 238; 240 – 241; 294 – 295; 3/6 – 327; 340 – 341.
10. Беларускія пісьменнікі – юбіляры 2003 года: метадычныя парады да 90-годдзя з дня нараджэння А.М. Кулакоўскага (1913–1986) / склад. Н.У. Балукова, рэд. М.У. Лыка // Мінская абласная бібліятэка . – Мінск, 2003 . – 13 с.
11. Бруй, Л. Летапісец горада: да 70-годдзя з дня нараджэння А.М. Кулакоўскага / Л. Бруй // Шахцёр. – 1998. – 24 снежня.
12. Вацінава, С. «Маладосць» Кулакоўскага / Святлана Воцінава // ЛіМ. – 2014. – 3 студзеня.
13. Герцовіч, Я. Вайна і мір у творах Аляксея Кулакоўскага / Я. Герцовіч // Творчае крэда. – Мінск, 1970. – С. 118 – 148.
14. Гусак, С. На галоўным напрамку // Кулакоўскі А. Твой шлях перад табою. – Мінск: Нар. асвета, 1968.
15. 24 снежня – 90 год з дня нараджэння А.М. Кулакоўскага (1913-1986), пісьменніка // Новыя кнігі. – 2003. – №10. – С. 2 – 4.
16. Дзюбайла, П. Беларускі раман аб Вялікай Айчыннай вайне. – Мінск, 1964. – С. 154 – 156.

17. Жураўлеў, В.П. Дыялог паміж «Я» і «Мы» у працэсе пошуку ісціны / В.П. Жураўлеў // На шляху духоўнага самасцвярджэння. – Мінск, 1995. – С. 19 – 20.
18. Жураўлеў, В. Пракладаць дарогу праўдзе: творчасць А.М. Кулакоўскага / В. Жураўлеў // Полымя. – 1998. – №3. – С. 273.
19. З любоўю і спачуваннем да чалавека // Чалавек на вятрах часу. – Мінск, 1989. – С. 296 – 303.
20. Карнялюк, К. З таленавітай вёскі Кулакі: А. Кулакоўскі / К. Карнялюк // Шахцер. – 1997. – 12 верасня.
21. Козлов, В. Верен до конца: мемуары. – Москва, 1970.
22. Козлов, В. Люди особого склада: записки о партизанском движении в Белоруссии. – Мінск, 1973.
23. Кулакоўскі, А. Выбраныя творы ў 2-х тамах. Т. 2. – Мінск, 1984. – С. 392; 233.
24. Кулакоўскі, А. Таленты Салігоршчыны // Салігорскі веснік. – 1993. – 1 снежня.
25. Кулакоўскі Аляксей // Беларускія пісьменнікі: біябібліягр. слоўн.: у 6 т. / пад рэд. А.В. Мальдзіса. – Мінск: БелЭН, 1993. – Т.3. – С. 449 – 455.
26. Кулаковский Алексей Николаевич // Минская область: энциклопедия: в 2 т. / редкол.: Л.Ф. Крупец, Г.П. Пашков и др. – Минск: БелЭН, 2007. – Т. 2. – С. 241.
27. Кулаковский Алексей Николаевич // Республика Беларусь: энциклопедия: в 6 т. / Редкол.: Г.П. Пашков и др. – Минск: БелЭН, 2007. – Т. 4. – С. 343.
28. Кулакоўскі Аляксей Мікалаевіч // Беларуская энцыклапедыя: у 18 т. / Рэдкал.: Г.П. Пашкоў і інш. – Мінск: БелЭн, 2003. – Т. 8. – С. 571 – 572.
29. Кулакоўскі Аляксей Мікалаевіч // Памяць: гіст.-дакум. хроніка Салігорскага раёна. – Мінск, 2004. – С. 496 – 497.
30. Кулакоўскі Аляксей Мікалаевіч // Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі: у 5 т. / Рэдкал.: І.П. Шамякін і інш. – Мінск: Беларус. Сав. Энцыклапедыя, 1987. – Т. 3. – С. 153 – 154.
31. Куляшоў, Ф. Людзі і вайна / Ф. Куляшоў // У дарозе. – Мінск, 1988. – С. 131 – 137.
32. Лынькоў, М. Літаратура і жыцце: літаратурна-крытычныя артыкулы. – Мінск: Маст. літ., 1978. – С. 111.
33. Марціновіч, А. Гэтыя загадкавыя дабрасельцы / А. Марціновіч // Сувязь. – Мінск, 1994. – С. 90 – 113.

34. Марціновіч, А. Слова да таварыша, якое я хацеў бы сказаць на юбілейным вечары // Мележ І. Жыццёвыя клопаты. Артыкулы, эсэ, інтэрв'ю. – Мінск: Маст. літ., 1975.
35. Мележ, І. Збор твораў у 10-ці тамах. Т. 8. – Мн. 1983. – С. 209.
36. Навуменка, І. Бытавое як мастацкае / Іван Навуменка // Кніга адкрывае свет. – Мінск, 1978. – С. 213 – 216.
37. Овчаренко, А.Н. Современная белорусская проза (60-70 гг.) / А.Н. Овчаренко // Избранные произведення. В 2-х т. Т. 2. – Мінск, 1986. – С. 323 – 328.
38. Паўлаў, У. Баявы шлях пісьменніка / У. Паўлаў // Памяць: гістарычна-дакументальная хроніка Салігорскага раёна. – Мінск, 2004. – С. 196 – 197.
39. Пашкевич, Н. На эпическом направлении. Изд. перераб. – Москва, 1969. – С. 30 – 33; 148 – 204.
40. Пяцьдзесят чатыры дарогі: аўтабіяграфіі беларускіх пісьменнікаў. – Мінск, 1963. – С. 317; 322; 323.
41. Роднаму краю аддан̆ы: рэкамендацыйны бібліяграфічны дапаможнік, прысвечаны 90-годдзю А.М. Кулакоўскага / Даведачна-бібліяграфічная служба; склад. Сцяцэнка С.В., Марыніч В.А. – Салігорск, Салігорская РЦБ, 2003. – 12 с. – (Нашы землякі).
42. Скрыган, Я. Аповесць пра мужных людзей // Я. Скрыган. Выбраныя творы ў 2-х тамах. Т. 2. – Мінск, 1975.
43. Шамякін, І. Вопыт, талент, праца // Кулакоўскі А. Збор твораў у 4-х тамах. Т. 1. – Мінск, 1970.
44. Шамякін, І. Размова з чытачом. – Мн., 1973. – С. 219; 215 – 222.
45. Шкраба, Р. Дэталь і характар / Р.Шкраба // Моваю вобразаў. – Мінск, 1989. – С. 286 – 296.
46. Шкраба, Р. Скарбы: літаратурна-крытычныя артыкулы. – Мінск, 1973. – С.166 – 175.
47. Шырын, Л. Роднаму краю аддан̆ы: да 75-годдзя з дня нараджэння А.М. Кулакоўскага / Л.Шырын // Шахцёр. – 1998. – 24 снежня.

Складальнік: Ермаковіч, І.М.

Рэдактар: Аліхвер, Л.В.

ДУК «Салігорская раённая цэнтральная бібліятэка»

Аддзел бібліятэчнага маркетынгу